собствующих развитию умений и навыков переводческих технологий, которые станут необходимым инструментом в пополнении знаний в своей будущей профессии.

Список литературы

1. Миньяр-Белоручев, Р.К. Курс устного перевода. Французский язык / Р.К. Миньяр-Белоручев. – М.: «Московский лицей». – 1998. – 144 с.
2. Комиссаров, В.Н. Теоретические основы методики обучения перевода / В.Н. Комиссаров. – М.: «РЕМА», 1997. – 110 с.
3. Гудавичус, А. Сопоставительная семасиология литовского и русского языков / А. Гудавичус. – Вильнюс, 1985. – 176с.

# РОДАВА-ЖАНРАВАЯ І СТЫЛЁВАЯ ДЫФУЗІЯ Ў СУЧАСНАЙ БЕЛАРУСКАЙ ЛІТАРАТУРЫ

*Н.М. Дамброўская*
*Брэст, БрДУ імя А.С. Пушкіна*

Паскораныя тэмпы развіцця літаратурнага працэсу ў ХХ стагоддзі, актыўнае родава-жанравае і стылевае ўзаемадзеянне вымушаюць многіх сучасных тэарэтыкаў і практыкаў слоўнага мастацтва перагледзець традыцыйную родава-жанравую канцэпцыю, дапоўніць яе новымі вывадамі. У сувязі з гэтым у літаратуразнаўстве ўзнікае вялікая колькасць класіфікацый новых міжродавых і міжжанравых фармаванняў і іх вызначэнняў. Складанасць у выпрацоўцы адзінай дакладнай тэрміналогіі, у сістэматызацыі новых літаратурных утварэнняў сведчыць пра актуальнасць і неабходнасць глыбокага вывучэння праблемы сінтэзу родава-жанравых і стылёвых прыкмет, у прыватнасці, у другой палове ХХ стагоддзя на прыкладзе канкрэтных літаратур і канкрэтных аўтараў.

Мэта – аналіз родава-жанравай і стылёвай дыфузіі ў сучаснай беларускай літаратуры.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам сталі творы сучасных беларускіх пісьменнікаў В. Казько, У. Караткевіча, І. Пташнікава, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, Я. Сіпакова, А. Вярцінскага і інш. Асноўнымі метадамі даследавання з’яўляюцца гісторыка-функцыянальны, сістэмна-тыпалагічны і тэкстуальна-аналітычны.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Асабліва актыўна ўзаемадзейнічаюць эпічны і лірычны роды літаратуры, пра што сведчыць феномен лірычнай прозы, генезіс якой абумоўлены галоўным чынам зменамі ў структуры эпічнага твора і выяўляецца найперш праз узмацненне суб’ектыўных прынцыпаў арганізацыі матэрыялу (павышэнне арганізуючай ролі суб’ектыўна-аўтарскага пачатку). У выніку актывізацыі аўтарскага пачатку ў многіх творах В. Казько, У. Караткевіча, І. Пташнікава, Н. Гілевіча, Р. Барадуліна, Я. Сіпакова, А. Вярцінскага і інш. адбываецца пераразмеркаванне суб’ект-аб’ектных адносін, трансфармуецца жанрава-стылёвы модус, прыходзяць у рух многія элементы стылю, уключаючы сістэму тропаў, асаблівасці сінтаксісу і г.д.

Лірызацыя працэсу вобразнага перастварэння рэчаіснасці, што адбывалася на працягу многіх стагоддзяў, сур’езна ўплывала на эпіку, у выніку чаго з’явілася лірычная проза, у якой сувязь паміж родавымі прыкметамі найбольш відавочная. Лірычная проза – проза «імпрэсіяністычная, раскіданая, суб’ектыўная, якая ледзь адарвалася ад дзенніка і амаль не адарвалася ад верша» [2, с. 265]. Перадача пачуццяў, эмоцый у такіх творах з’яўляецца асноўным прынцыпам стварэння вобраза, а рэчаіснасць істотна трансфармуецца ў святле суб’ектыўнага аўтарскага ці героевага ўспрымання. Тут няма традыцыйнай фабулы: яна «выціснута» паэтычнай думкай, перажываннем або падпарадкавана ім. Апавядальны (эпічны) матэрыял становіцца асновай прадметна-вобразнай аб’ектывізацыі душэўнага стану лірычнага героя, што і складае лірычнае, спавядальнае адзінства накшталт сюжэтнага.

Працэс узаемапранікнення жанравых асаблівасцей, вяртанне да неасінкрэтызму ўсе больш вызначае жанравы рух сучаснай прозы, абумоўлівае змены ў структуры эпічнага твора і выяўляецца найперш праз узмацненне галоўным чынам ролі суб’ектыўна-аўтарскага, асабістага пачатку, што часта звужае сюжэт твора да перадачы свядомасці лірычнага героя. Суб’ектыўныя прынцыпы арганізацыі матэрыялу прыводзяць да парушэння прапорцый у перастварэнні рэчаіснасці і, як вынік, да той ці іншай формы суб’ектывізму. Паколькі эпас апісальны, «прывязаны» да сюжэта і факта і традыцыйна кананізаваны ў гэтым плане, то мастакі слова ўсяляк



Рэпазіторый БГУ

імкнуцца пераадолець зададзенасць на аб'ектывізм, адысці ад родавых абмежаванняў, надаць большую важкасць свайму ўласнаму выказванню, суб'ектыўнай ацэнцы з'яў.

Лірызм у эпічным творы выяўляецца не толькі ў наяўнасці лірычнага героя ў ім, але і ў тым, што прадметам даследавання ў дадзеным выпадку з'яўляецца псіхалагічны стан асобы; што ў сферы аб'ектыўнага мастак актыўна шукае адбіткі перажыванняў, тлумачэнне з'яў і чалавечых учынкаў. Адлюстраванне рэчаіснасці ў лірычнай прозе – гэта праекцыя ўнутранага стану, перажыванняў і настрою лірычнага суб'екта. Структурна арганізуючую функцыю ў лірычным празаічным творы часам выконвае лейтматыў, якім з'яўляецца настрой, эмацыянальны тон, пэўныя разважанні лірычнага героя. Гэтая асаблівасць, як адзначае А.М. Макарэвіч, даследуючы праблему сінтэзу лірычнага і рэалістычнага пачаткаў у беларускім апавяданні пачатку XX стагоддзя, была характэрна для многіх тагачасных твораў [1]. Праецыраванне настрою асобы на аб'ектыўны свет прыводзіць не толькі да своеасаблівай суб'ектыўнай інтэрпрэтацыі рэчаіснасці мастаком, але і да трансфармацыі ўсіх элементаў жанрава-стылевай структуры мастацкага твора – ад выбару і апісання з'явы, падзеі да асобных элементаў стылю, уключаючы асаблівасці сінтаксісу. У пабудове сюжэта аўтар-лірык не прытрымліваецца перадачы лагічнай паслядоўнасці падзей, аддае перавагу не паступоваму разгортванню фабулы, а паказу складанага і супярэчлівага працэсу духоўнага росту, прасвятлення (ці ачарсцвення) асобы, руху яе пачуццяў і думак. Па гэтай прычыне творам уласцівая даволі свабодная прасторава-часавая арганізацыя, павышаная эмацыянальнасць, суб'ектыўнасць аўтарскай ацэнкі, спавядальнасць. Адзначаныя змены ў эпічным творы служаць асноўнай мэце – паказаць станаўленне духоўнага свету асобы, сканцэнтраваць увагу рэцыпіента на эвалюцыі характару суб'екта.

Лірычнай прозе характэрны адметны, паэтычны спосаб пазнання і адлюстравання рэчаіснасці, наяўнасць спецыфічнага ракурсу паказу з'яў – «праз сябе». Гэта тая проза, калі аўтар прапускае праз сваю асобу падзеі рэчаіснасці, чалавечыя перажыванні і пачуцці, напаўняючы твор уласным эмацыянальным светаадчуваннем, якое стварае непаўторны суб'ектыўна-экспрэсіўны фон. Такім чынам, адметнасць стылю сучаснай лірычнай прозы заключаецца не толькі і не столькі ў знешняй прыгажосці, паэтычнасці, метафарызацыі пісьма, колькі ў тым, што аўтар прымае лірычную канцэпцыю вобразнага пераствАрэння свету і кіруецца ею.

Родава-жанравае ўзаемадзеянне, у сваю чаргу, абумовіла стылёвыя змены ў мастацтве слова. На змену эпічна-спакойнаму, «ураўнаважанаму» ў эмацыйна-пачуццевых адносінах эпіка-апісальнаму пісьму прыходзіць экспрэсіўнае пісьмо, падобнае да таго, якое яшчэ ў 10–20-я гады XX стагоддзя зведала беларуская літаратура і якое было прадстаўлена малой прозай Цеткі («Прысяга над крывавымі разорамі»), Максіма Багдановіча («Апокрыф»), Кузьмы Чорнага (апавяданні першай паловы і сярэдзіны 20-х гадоў), Змітрака Бядулі (абразкі, экспрэсіі), Алеся Гаруна (проза) і іншых аўтараў. На глебе суб'ектывізацыі стылю з'ўляліся і медытатыўнасць, і філасафічнасць. Названыя адзнакі стылю ўтрымліваюцца ў малой прозе і ў наш час, аднак перыяд сацыяльных перамен унес дадатковыя «колеры» на стылевую «палітру» літаратуры: лірызацыя дапаўняецца травесційнасцю. Алегарызм, прыпавесційнасць, сімволіка ў творчасці асобных пісьменнікаў – Янкі Сіпакова, Вячаслава Адамчыка, Віктара Карамазава, Івана Пташнікава, Віктара Казько і іншых – часам выходзяць на першы план, становяцца дамінантнымі рысамі твораў. А за гэтымі рысамі вельмі часта паўстае схаваная іронія ці – бывае – непасрэдна, напрамую выяўляецца востра сатырычная ацэнка трансфармаваных у вобразы жыццевых рэалій.

**Заключэнне.** Літаратура другой паловы XX стагоддзя пад уплывам грамадскіх падзей і ў сувязі з неабходнасцю замены нарматыўнага (у межах сацыялістычнага рэалізму) пісьма больш свабодным паглыбляла і пашырала тэматычны дыяпазон, пераадольвала родава-жанравую і стылёвую зададзенасць. У абсягах перамен, што адбываліся ў слоўным мастацтве названага перыяду, развівалася лірычная проза – вынік працэсу ўзаемаўплыву эпічнага і лірычнага родаў літаратуры.

Спіс літаратуры

1. Макарэвіч, А.М. Праблема жанравых мадыфікацый у беларускай прозе XIX – пачатку XX ст. / А.М. Макарэвіч. – Магілёў : Выд-ва МДУ імя А.А. Куляшова, 1992. – 332 с.
2. Павловский, А.И. О лирической прозе (Ольга Берггольц и Владимир Солоухин) / А.И. Павловский // Время. Пафос. Стиль / А.И. Павловский ; под ред. В.В. Бузник, В.А. Ковалёва. – М., 1965. – С. 247– 271.

Рэпазіторый ВДУ